**24.** Вучні вызначалі гукі, якія не вымаўляюцца ў канцы слоў. Ігнат прапанаваў [ф], [п], [х]. Змітрок – [в], [б], [г]. Пятрусь – [п], [в], [г].

Хто з вучняў адказаў правільна?

**А)** усе вучні. **Б)** ніхто з вучняў не даў правільнага адказу.
**В)** Ігнат. **Г)** Змітрок. **Д)** Пятрусь.

**25.** У даўнія часы ў сялян не было гадзіннікаў. Замест іх слухалі спеў пеўняў і вызначалі, якая пара: *а) поўнач; б) пара ўставаць; в) світанне*. Так і казалі: *«Прачнуўся пасля другіх пеўняў… Дзеці леглі спаць пасля першых пеўняў»*. Дапоўніце выразы:

*1) першыя пеўні – …; 2) другія пеўні – …; 3) трэція пеўні – … .*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 2-в, 1-б, 3-а.
**Г)** 3-б, 2-а, 1-в. **Д)** 2-б, 1-в, 3-а.

**26.** Якім членам сказа з’яўляецца выдзеленае слова ў сказе?

*У дружбе **жыць** – такі закон спрадвеку ў народзе.*

**А)** дзейнік. **Б)** выказнік. **В)** дапаўненне.
**Г)** азначэнне. **Д)** акалічнасць.

**27.** Выберыце з прапанаваных словы, у якіх усе зычныя гукі мяккія:

*1) спець; 2) змяіны; 3) цвісці; 4) бярвенне.*

**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** усе варыянты, акрамя 4. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 4.

**28.** Вызначце правільна напісаныя словазлучэнні:

*1) расшчапіць атам; 2) расшчапіць бервяно; 3) расшчапіць дрот.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**29.** Літара **э** з’явілася ў беларускіх тэкстах у канцы … .

**А)** XI стагоддзя. **Б)** XIII стагоддзя. **В)** XIV стагоддзя.
**Г)** XV стагоддзя. **Д)** XVII стагоддзя.

**30.** Які дзень лічыцца **Днём літары *ё***?

**А)** 3 лютага. **Б)** 25 красавіка. **В)** 19 чэрвеня.
**Г)** 1 верасня. **Д)** 29 лістапада.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб’яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3–218
тэл. (017) 292 80 31, 290 01 53
e-mail: info@bakonkurs.by http://www.bakonkurs.by/

ГА «БА «Конкурс». Заказ 14. Тыраж 37700 экз. г. Мінск. 2014 г.

# Конкурс па беларускай мове «БУСЛІК-2014»

*Чацвер, 20 лютага 2014 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу; пры парушэнні гэтых патрабаванняў удзельнікі могуць быць дыскваліфікаваны;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце http://www.bakonkurs.by/ праз 1-1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 5-6 класаў

**1.** Разгадайце народную загадку:

*Хата кругом свіціцца.*

**А)** кошык. **Б)** збанок. **В)** ваза. **Г)** стол. **Д)** малюнак.

**2.** Падбярыце з прапанаваных слоў сінонім(-мы) да назоўніка ***фальш***:

*1) падман; 2) ашуканства; 3) падробка.*

**А)** усе словы. **Б)** 1. **В)** 1, 2. **Г)** 2. **Д)** 3.

**3.** Колькі разоў ужыта літара ***я***, якая абазначае адзін **[а]** у словах вершаваных радкоў Галіны Каржанеўскай?

*Назбіраю лісцяў я*
*У двары,*
*Што зляцелі з клёніка*
*Без пары.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

**4.** Якая часціна мовы называе дзеянне, змену стану аб’екта?

**А)** назоўнік. **Б)** прыметнік. **В)** дзеяслоў. **Г)** займеннік. **Д)** прыслоўе.

**5.** Выберыце пары слоў, у якіх націск дапамагае адрозніць іх значэнне:

1*) стала – стала;* *2) туга – туга;*
*3) выразаць – выразаць;* *4) прызнаюся – прызнаюся.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**6.** Колькі слоў ужыта ў сказе?

*Язноўзнадзеяйітрывогайкрочупазагадкавайзямлі.*

**А)** 7. **Б)** 8. **В)** 9. **Г)** 10. **Д)** 11.

**7.** Якія гукі ў беларускай мове не маюць спецыяльных літар?

*1) [дз']; 2) [дз]; 3) [ж]; 4) [дж]; 5) [ч]; 6) [р].*

**А)** няма правільных варыянтаў. **Б)** 1, 2, 4. **В)** 2, 4. **Г)** 3, 5, 6. **Д)** 4, 5.

**8.** Вызначце правільную транскрыпцыю слова:

1) *сшытак* – [сшытак]; 2) *тчэш* – [ччэш]; 3) *наладчык* – [налатчык].

**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**9.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску напішаце ***ь***?

*1) чарсц..вець; 2) лісц..вяны; 3) рэдз..ка; 4) агледз..ся.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**10.** Колькі назоўнікаў у форме адзіночнага ліку меснага склону ўжыта ў вершаваных радках Ніла Гілевіча?

*Хлеб – у дзяжы і на лапаце,*
*На подзе ў печы, на стале.*
*І на далонях шчаснай маці,*
*Што дзецям лусты раздае.*

**А)** 0. **Б)** 3. **В)** 5. **Г)** 6. **Д)** 7.

**11.** У якіх словах правільна падкрэслена націскная галосная?

*1) цэм<u>е</u>нт; 2) мез<u>е</u>нец; 3) цяж<u>а</u>р; 4) зн<u>а</u>хар.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

**12.** Выберыце з прыведзеных розначаранёвыя дзеясловы:

*1) скочыць – скочвацца; 2) прасіць – прасаваць; 3) абвязаць – абавязаць.*

**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

**13.** Вызначце толькі дзеясловы абвеснага ладу:

*1) прабачыла; 2) прабачу; 3) прабач; 4) прабачыла б.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма дзеясловаў абвеснага ладу.
**В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**14.** Выберыце з дадзеных назоўнік, які няправільна ўжыты ў форме творнага склону:

*1) веліччу; 2) мыш'ю; 3) глыб'ю.*

**А)** усе варыянты. **Б)** няма правільнага варыянта. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**15.** Які(-ія) з дадзеных якасных прыметнікаў не мае(-юць) кароткай формы?

*1) згодны; 2) рады; 3) плоскі.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 2, 3. **Д)** 3.

**16.** Вызначце з прапанаваных толькі назоўнікі мужчынскага роду:

*1) жаль; 2) фальш; 3) немач; 4) продаж; 5) гар.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** усе назоўнікі, акрамя 3. **В)** 1, 2. **Г)** 3, 4. **Д)** 4, 5.

**17.** Выберыце з дадзеных просты двухсастаўны сказ:

*1. Дарогі вузкія і шырокія, роўныя і выкручастыя, брукаваныя і прасёлкавыя.*
*2. Ён пасля вучобы пачаў займацца ў спартыўнай секцыі, удзельнічаць у спаборніцтвах.*
*3. Узнялося сонца над зямлёю, ласкавае, яркае.*

**А)** усе сказы. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1. **Г)** 2. **Д)** 3.

**18.** Вызначце правільны варыянт запісу дзеяслова ***есці*** ў форме 2-ой асобы множнага ліку цяперашняга часу.

**А)** ясі. **Б)** есць. **В)** ядзім. **Г)** ядзіце. **Д)** ясце.

**19.** Лексічнае значэнне '*малы*' мае фразеалагізм … .

**А)** хоць вока выкалі. **Б)** кату па пяту. **В)** лахі пад пахі.
**Г)** лоб у лоб. **Д)** як кот наплакаў.

**20.** Вучні абмяркоўвалі, якую форму 3-яй асобы адзіночнага ліку мае дзеяслоў ***быць***. Алесь прапанаваў – *будзе*, Вера – *ёсць*, Стас – *быць*.

Хто з вучняў правільна адказаў?

**А)** усе вучні. **Б)** дадзены дзеяслоў не мае такой формы.
**В)** Алесь. **Г)** Вера. **Д)** Стас.

**21.** Выберыце з прапанаваных толькі назоўнікі, утвораныя суфіксальным спосабам:

*1) цясляр; 2) будан; 3) цеплыня; 4) альпініст.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма патрэбных варыянтаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

**22.** У народзе гавораць: *«Ганяцца за … зайцамі»*. Якога слова не хапае?

**А)** двума. **Б)** дзвума. **В)** двюма. **Г)** двумя. **Д)** дзвюмя.

**23.** Падбярыце беларускі(-ія) адпаведнік(-і) да ўстойлівага выразу з рускай мовы *от альфы до омеги*:

*1) асноўнае, галоўнае;* *2) ад пачатку да канца;*
*3) салаўя байкамі не кормяць;* *4) бездань прамудрасці.*

**А)** усе прыклады. **Б)** няма правільных варыянтаў.
**В)** 1, 2, 3. **Г)** 2. **Д)** 4.